## ПАХАВАНЫЯ Ў НЕБЕ

У тэатры, як і ў жыцьці, немагчыма з пэўнасьцю падзяліць людзей на жывых і мёртвых.

Прызначэньне тэатру — уваскрашэньне нябожчыкаў, хай сабе і часовае, коштам штовечаровага самагубства актораў. Знакамітая французская актрыса Сара Бэрнар мела звычку рыхтавацца да спэктаклю лежачы ў труне (некаторыя артысты проста зачыняюцца ў цёмнай грымёрцы і мэдытуюць перад агеньчыкам сьвечкі). Тэатр — гэта могілкі з адкрытымі трунамі, і пакуль ён існуе — перамога сьмерці яшчэ не канчатковая.

У сялянскім сьветаглядзе хрысьціянская канцэпцыя адной на ўсё жыцьцё сьмерці зьнітаваная з паганскаю верай у вечныя гастролі душы: “бог не дае людзям уласных душаў — з аднаго выме, а другому ўсадзіць” (А.Багдановіч, “Перажыткі старадаўняга сьветасузіраньня ў беларусаў”). Пасьля сьмерці чалавека душа не адразу пераходзіць у замагільны сьвет: сорак дзён яна яшчэ застаецца ў родным сяле; зь іх спачатку шэсьць дзён ходзіць каля дому і тры дні — па сваіх гародах і палях. Потым яна альбо выпраўляецца на той сьвет, куды ёй наканавана, — у пекла ці ў рай — альбо застаецца тут, на зямлі: пасяляецца ў дрэве (такое дрэва рыпіць), у жывёле ці ў іншым чалавеку. Такі чалавек пакутуе, пакуль душа, што пасялілася ў ім, ня выкупіць усіх сваіх грахоў.

У беларускіх вёсках існаваў звычай абкурваць цела нябожчыка сьвянцонымі зёлкамі, каб засланіць яго дымам ад нячысьціка. Супрацоўнікі савецкіх моргаў з гэтай жа мэтаю бралі на дзяжурства і патроху спальвалі стосы старых нумароў газэты “Правда” (другой прычынаю былі ненадзейныя лядоўні).

Эгіпцяне верылі, што нябожчык, муміфікаваны належным чынам, уваскрасае і працягвае сваё жыцьцё ў іншасьвеце. Няма нічога дзіўнага ў тым, што менавіта гэтую пахавальную тэхналёгію абралі бальшавікі для цела свайго правадыра. Ёсьць падставы меркаваць, што на муміфікаванага Леніна ЦК партыі ўсклаў сакрэтную місію падрыхтаваць Кастрычніцкую рэвалюцыю спачатку ў апраметнай найстарэйшага эксплюататарскага грамадзтва, а потым і ў астатніх замагільных царствах. Пачаць з эгіпцянаў было вырашана таму, што ратаваць ад клясавага прыгнёту душы першабытных людзей, з марксысцкага гледзішча, патрэбы няма, бо ў той гістарычны пэрыяд эксплюатацыі яшчэ не было. Такім чынам, калі Ільліч выканае апошняе партыйнае даручэньне — здолее ўсталяваць на тым сьвеце савецкую ўладу і дамагчыся электрыфікацыі ўсіх пеклаў — пры камунізме будуць жыць адразу ўсе пакаленьні людзей, хай сабе й пасьля сьмерці.

У Тыбэце трупы выбітных людзей таксама муміфікаваліся, а парэшткі нябожчыкаў з ніжэйшых клясаў пакідаліся на пачастунак жывёлам. Калі на труп зьляталіся птушкі і расьцягвалі адарваныя кавалкі па гнёздах — лічылася, што душа нябожчыка адправілася на неба. Калі ж цела зьядалі свіньні альбо сабакі — гэта сьведчыла, што душы наканавана ізноў нарадзіцца на зямлі. Добрага чалавека зьвяры зьядалі хутка, а кепскі, якога на тым сьвеце чакала пакараньне, доўгі час заставаўся нязьедзены.

Ускрыцьцё трупа раней рабілася толькі ў некаторых спрэчных выпадках — калі трэба было вызначыць, добрым ці кепскім быў чалавек і паводле якога рытуалу яго трэба хаваць. Знахар разразаў цела, аглядаў вантробы і

паведамляў старшыням племя свае высновы. У залежнасьці ад вынікаў агляду "добрага" нябожчыка з пашанай хавалі (ці спальвалі) у прыгожай труне, а шкоднага і небясьпечнага закопвалі як мага хутчэй.

Культ зямлі ў патрыётаў зьнітаваны ня толькі зь яе ўрадлівасьцю, але і з парэшткамі продкаў, якія яе апладняюць. Звычайна мы адчуваем прысутнасьць нябожчыкаў у зямлі пад нагамі толькі на сваёй радзіме, але, па сутнасьці, братняй магілаю зьяўляецца ўся паверхня плянэты, у тым ліку мы самі. Цела — гэта свайго кшталту магільная пліта над душою, пахаванай у зямным жыцьці (Плятон, дыялёг "Кратыл"). Калі чалавек нараджаецца на сьвет, ён трапляе ў магілу чарговага цела. Сьмерць, у пэўным сэнсе, — проста перапахаваньне з адной магілы ў іншую.

У бальшыні эпізодаў свайго лёсу мы ня столькі жывём, колькі выконваем функцыю надмагільных помнікаў папярэднім пакаленьням. Часам жудасна бачыць усе гэтыя модна ці абы-як апранутыя статуі, што шпацыруюць па вуліцах, стаяць у чэргах альбо едуць у цягніку мэтро з адных могілак да іншых. Скамянеласьць чужога жыцьця ня ўражвае нас толькі таму, што мы і самі звычайна пазіраем на сьвет вачыма нябожчыкаў. У кожным чалавеку жывуць тысячы трупаў, прычым шмат хто з насельнікаў нутраных могілак — гэта ён сам у сваіх ранейшых узростах, звычках і нязьдзейсьненых марах. Мы нараджаемся і паміраем на працягу ўсяго жыцьця і нават пасьля яго, аднак па старой халдэйскай традыцыі сьвяткуем дзень народзінаў толькі раз на год. Хутчэй за ўсё дзень народзінаў прыдумалі астролягі, каб зручней было складаць гараскопы — спачатку для цароў, а цяпер і для падпісчыкаў бульварных выданьняў.

У адрозьненьне ад жывёлы, чалавек ня здольны ні канчаткова нарадзіцца, ні дарэшты памерці. Праз нас вяртаюцца ў гэты сьвет і зноў сыходзяць зь яго нашыя продкі (у тым ліку героі мастацкіх твораў і старажытных мітаў), а мы, са свайго боку, падсьвядома жывем і мярцьвеем празь іх у замагільных царствах. Чалавецтва існуе адразу ва ўсіх сваіх пакаленьнях. Усе мы — былыя, будучыя і цяперашнія выканаўцы роляў жывых і нябожчыкаў — належым ня так фізычнаму сьвету прыроды, як мэтафізычнаму сьвету культуры, дзе бег часу вымяраецца не гадамі, а вечнасьцямі.

Культурны слой плянэты, у якім мы жывем ад сьмерці да сьмерці, невымерна шырэйшы за тыя некалькі мэтраў глебы, у якіх звычайна корпаюцца архэолягі ды шукальнікі скарбаў. Нават у фізычным пляне ён ужо вырас да ваколземнай арбіты, а неўзабаве павінен дасягнуць межаў Сонечнай сыстэмы (на Месяц і на Марс сваё сьмецьце чалавек ужо закінуў). Патрыярх касманаўтыкі Канстанцін Цыялкоўскі распрацаваў тэорыю міжплянэтных падарожжаў пад уплывам рэлігійнага філёзафа Мікалая Фёдарава, аўтара праекту ажыўленьня ўсіх пакаленьняў нябожчыкаў, пачынаючы зь першага чалавека. Цыялкоўскі ўсьвядоміў, што ў выпадку посьпеху гэтай грандыёзнай задумы месца на Зямлі новым людзям ня хопіць, і трэба будзе перасяляць іх у космас.

Але і ў небе людзей пахавана ня менш, чым у глебе. Пра гэта сьведчыць, напрыклад, пашыраны ў шмат якіх плямёнаў культ зорак, зь якіх нам сьвецяць душы продкаў. Тую ж ідэю ўнебаўзяцьця нябожчыка адлюстроўвае звычай спальваньня трупа: цела імкліва ператвараецца ў дым і растае ў паветры. Зараастрыйцы будавалі адмысловыя "вежы моўчы", у якіх пакідалі

трупы на пажытак птушкам. Як мага бліжэй да неба — на галінах дрэваў альбо на высокім памосьце — хавалі нябожчыкаў індзейцы. У трапічных і нават у нашых лясах трупы часам пакідаліся расьці ў неба ўсярэдзіне пустых дрэваў (у Заходняй Афрыцы ў дуплах баабабаў хавалі толькі народных паэтаў).

Можна закапаць чалавека ў неба і ў выглядзе помніку на месцкім пляцы: калі зірнуць на яго зблізу — лінія далягляду не дасягае нават падэшваў статуі (здалёк звычайна здаецца, што помніку зямля — па калена). Калі імпэратар Калігула загадаў абезгаловіць найбольш шанаваныя статуі рымскіх багоў і прыставіць да іх выяву сваёй галавы, у гэтым не было ніякае рацыі. Разгледзець рысы твару скульптуры на фоне сьветлага неба амаль немагчыма, мы бачым толькі скамянелы цень: ён падобны да кожнага з нас.

Чаму мы нарадзіліся менавіта на гэтай плянэце, хоць іх у космасе — мільярды? Трупы людзей і жывёлаў буцьвеюць тут вельмі хутка: зямное паветра не спрыяе існаваньню высокаарганізаванай матэрыі, у якой прыпыніўся абмен рэчываў. Жыцьцё на Зямлі існуе нібыта ў чужародных, экстрэмальных умовах. Але ж павінны дзесьці існаваць (альбо будуць створаныя намі) такія фізычныя і духоўныя прасторы, дзе жыцьцё — ужо не выключэньне, а правіла, дзе не было і ня будзе мёртвых і ненароджаных.

Хто ж такая Зямля — нашая маці альбо мачыха? Уфолягі ўпарта шукаюць нейкіх прыхадняў, але найбольш разумныя (напрыклад, Дыяген) робяць наадварот: яны шукаюць сярод нас хаця б аднаго тутэйшага чалавека. Калі жыцьцё прывандравала на Зямлю зь нейкай іншай плянэты — тады зразумела, чаму чалавецтва імкнецца перастварыць аблічча Зямлі насуперак мясцоваму часу і клімату, навошта людзі высякаюць лясы, рыюць каналы, сынтэзуюць невядомыя на гэтай плянэце хімічныя рэчывы, гадуюць дзіўныя пароды расьлінаў і жывёлаў. Мы бесьсьвядома пераствараем тутэйшую прыроду паводле няўцямнага праобразу пазабытай радзімы. Вось так і Рабінзон спрабаваў надаць пакрытай джунглямі высьпе хай сабе крыху эўрапэйскае аблічча.

Больш верагоднаю мне, аднак, падаецца гіпотэза аб зямным паходжаньні чалавецтва: замест кожнага з нас нараджаецца і памірае нашая плянэта. Ніхто не жыве сам па сабе, гэта плянэта жыве праз нас усіх. Клеткі жывёлаў, грыбоў і вышэйшых расьлінаў — гэта нашчадкі сужыхарства больш простых арганізмаў. Адно без аднаго мы засталіся б звычайнымі мікробамі, ці яшчэ верагодней — кісялём з арганічных малекулаў.

Пасаджанае калісьці Дарвінам “дрэва эвалюцыі”, дзе аднойчы адасобленыя галіны больш не ўзьядноўваюцца, варта было б замяніць вобразам сеткі ці нават віхуры жыцьця, дзе няма адзінага вытоку і цэнтру, дзе ўсе гены могуць калі-небудзь сустрэцца і памяняцца месцамі, а арганізмы — формамі. У генэтычных дый іншых біятэхналёгіях няма нічога новага, папросту яны дзейнічаюць нашмат хутчэй за натуральную эвалюцыю.

Усе тутэйшыя істоты і рэчы складаюць агульны арганізм, у якім чалавецтву прызначана роля органу размнажэньня. Зямля трывае бедзтвы, якія суправаджаюць разьвіцьцё цывілізацыі, дзеля магчымасьці пакахацца зь іншымі нябёснымі целамі. Начныя палюцыі касьмічнымі караблямі ў ваколземную прастору сьведчаць, што наша агульнае цела ўжо дасягнула полавай сталасьці.

Раней ці пазьней людзі атабарацца і на іншых плянэтах. Можна не сумнявацца, што чалавек будзе імкнуцца паўсюль узнавіць умовы жыцьця, да

якіх прызвычаіўся на Зямлі. На пустэльныя плянэты будуць перанесеныя шмат якія зямныя ляндшафты, расьліны, жывёлы й мікраарганізмы.

Цалкам верагодна, што людзі ўзновяць на калянізаваных нябёсных целах ня толькі звыклую геаграфію зь яе гарадамі і рэкамі, але і гісторыю. І тут могуць спатрэбіцца ўсе акторскія і сцэнаграфічныя здольнасьці, разьвітыя ў нас за тысячагодзьдзі эвалюцыі культуры. Імправізуючы, прыстасоўваючыся да новых умоваў, мы паспрабуем паўсюль ажыцьцявіць грандыёзную пастаноўку п’есы пад назваю “Зямля”. Калі ж падчас сваіх падарожжаў чалавек напаткае ўжо населеныя плянэты, ён абавязкова ангажуе тамтэйшых істотаў, а таксама іх рэчы і ляндшафты для паказу на Зямлі і, такім чынам, возьме на сябе выкананьне сужэнскіх абавязкаў паміж жывымі плянэтамі.

Зямля жыве запаволеным, паводле нашых дразафільскіх мерак, але ня менш энэргічным жыцьцём. Нам цяжка ўявіць сабе маштабы жарсьцяў, здольных перасоўваць горы і кантынэнты, а яшчэ цяжэй зразумець тэктанічную міміку, расьцягнуты на сотні мільёнаў гадоў танец горных сыстэмаў: ці то хмурыцца Зямля, ці то ўсьміхаецца? Хутчэй за ўсё камары таксама не разумеюць выразаў чалавечага твару.